*Г. В. Кажамякін,*
*вядучы бібліятэкар аддзела рэдкіх кніг*
*БДПУ імя М. Танка,*
*кандыдат філалагічных навук*

# ПРАБЛЕМЫ ЗАХАВАНАСЦІ ФОНДАЎ РЭДКІХ КНІГ

Бадай, найважнейшым цяпер пытаннем, звязаным з рэдкай кнігай, ёсць праблема захавання для прышласці гэтага гісторыка-культурнага скарбу. Падобная праблема сёння становіцца яшчэ больш вострай.

Як вядома, справамі рэдкіх кніг у бібліятэцы займаецца адмысловая структура – аддзел рэдкай кнігі. У розных бібліятэчных установах, у тым ліку навучальных, у адпаведнасці з сітуацыяй такія аддзелы часам адрозніваюцца паводле спецыфікі сваёй дзейнасці. Але ўсюды такія структуры маюць на мэце ў той ці іншай ступені даследаванне фонду, абслугоўванне чытачоў, правядзенне экскурсій. Зразумела, што аддзел не можа не дапускаць карыстальніка да фонду рэдкіх кніг, бо павінны выконвацца правы чытачоў. Але існуюць і асаблівыя выпадкі, якія, па ўсёй верагоднасці, разумеюцца бібліятэкарамі неадназначна. Напрыклад, кніга дэфектная. На думку шмат якіх спецыялістаў кніжнай справы, рэстаўрыраваць яе нельга, бо гэта можа пашкодзіць дакумент. Акрамя таго, паўстае пытанне: як практычна можна выкарыстоўваць кнігу, калі яе аркушы рассыпаныя ці разарваныя. У гэтым выпадку можна назіраць два падыходы:

1) не выдаваць, пакуль не вырашыцца пытанне з капіраваннем асобніка, напрыклад сканаваннем, фатаграфаваннем. Маецца на ўвазе, што арыгінальны дакумент павінен захоўвацца толькі дзеля захаванасці і выкарыстання пры вострай патрэбе або паказу на аглядзе выстаўкі пад спецыяльным шклом у часе экскурсіі;

2) пры патрэбе пашкоджаны дакумент падклейваць, чытачу выдаваць, наведвальнікам на экскурсіі даваць патрымаць у руках. Такі погляд грунтуецца на прынцыпах дэмакратызацыі бібліятэкі. Маўляў, любы дакумент павінен быць дастаўлены чытачу паводле патрабавання. І навошта захоўваць кнігу, калі ёй ніхто не можа карыстацца?

Першая пазіцыя найбольш слушная толькі з пэўнымі агаворкамі. Каб ашчадзіць такую кнігу, трэба проста ставіць абмежаванне на яе выкарыстанне, выдаваць паводле спецыяльнага дазволу. Існуе нямала выданняў, папера якіх стала крохкая і рассыпаецца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асабліва гэта тычыцца асобнікаў, якія выходзілі з канца XIX ст. – часу Бракгауза і Эфрона.

Цяпер жа перш за ўсё трэба нагадаць, якія найбольшыя пагрозы для кніг існуюць сёння. Ужо цяпер усё часцей чуецца пра распаўсюджванне па друкаваных выданнях грыбка, які ў выпадку бяздзеяння можа знішчыць кнігу. Таксама не меншай бядой ёсць кніжная цвіль. Акрамя таго, на працягу стагоддзяў кнігі псаваліся і нішчыліся грызунамі і насякомымі. І сёння на некаторых кнігах векавой даўнасці можна ўбачыць сляды такога ўздзеяння. Можна нават было б увесці ва ўжытак такую адмысловую тэрміналогію, як пашкоджанні: *біялагічнае* (грыбок, цвіль і да т. п.) і *заапаразіталагічнае* (псаванне грызунамі, нясякомымі). Трэба памятаць, што біялагічнае пашкоджанне развіваецца і ў выніку механічнага ўздзеяння вільгаці, рэзкай змены тэмпературнага рэжыму, няправільнага захоўвання дакумента, у тым ліку антысанітарных умоў.

Гаворачы пра грыбковае паражэнне кніг, мы мусім заўважыць адну вельмі важную праблему беларускага бібліяфільства і кніжнай справы, датычную часу апошніх дзесяцігоддзяў. Рэч у тым, што недзе з 1992 г. у беларускай паліграфіі выкарыстоўваўся заражоны грыбком кардон адной з фабрык Беларусі. Акрамя таго, матэрыял змяшчаў у сабе метацыд. У выніку вялізная частка беларускіх кніг 1990-х гг., якія выйшлі ў цвёрдым пераплёце, маюць характэрныя шэрыя ці рудыя плямы на вокладцы або на форзацы. У некаторых з іх плямы распаўсюдзіліся і далей на старонкі. Так пацярпелі выданні класікаў беларускай літаратуры, асобныя энцыклапедычныя тамы, некаторыя папулярныя фундаментальныя даследаванні. Прыкладам можна назваць Поўныя зборы твораў Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Беларускую энцыклапедыю, Энцыклапедыю гісторыі Беларусі, біябібліяграфічны слоўнік у шасці тамах «Беларускія пісьменнікі», факсімільнае выданне газеты «Наша Ніва» і г. д. Але гаворка ідзе не пра кожны асобнік і не пра кожны том. У некаторых выданнях былі пашкоджаныя асобныя тамы. І часам, праглядаючы іншыя экзэмпляры, можна заўважыць, што яны не маюць у сабе такіх плямаў. Разам з тым мікрабіёлагі сцвярджаюць пра адсутнасць пагрозы далейшага распаўсюджвання паражэння з гэтых кніг на іншыя, бо сам грыбок даўно нежывы. Але з паражонымі выданнямі 1990-х гг. трэбы абыходзіцца асабліва асцярожна. Нельга дапускаць, каб на іх траплялі нават кроплі вады і сонечныя промні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння ў свеце існуе наогул пагроза грыбковага знішчэння ўнікальных кніг. Колькі гадоў таму сцвярджалася, што грыбок можа знішчыць Астрожскую Біблію Івана Фёдарава. Гэтак паведамлялася: «У Украіне пад пагрозай знішчэння апынулася ўнікальная калекцыя старадрукаў.

У Астрозе Ровенскай вобласці грыбок ужо паразіў вежу, дзе знаходзіцца музей, у якім захоўваюцца 1,5 тыс. старынных кніг, і перайшоў на рарытэты. Гэта найлепшая калекцыя ў Украіне, у ліку якой і славутая Астрожская Біблія першадрукара Івана Фёдарава <…>

Ужо цяпер частка кніг мае патрэбу ў тэрміновай рэстаўрацыі, бо ад волкасці склеіліся і згнілі старонкі» (Рэспубліка. 2007. 24 студз.).

Вядома, што, рабіліся захады па ратаванні кніг, але гэты выпадак – трывожны сігнал.

Несумненна, што, калі гаварыць наконт прыярытэтнасці, актуальнасці тэмы даследавання па бібліятэказнаўстве, варта заўважыць: адной з найважнейшых ёсць разгледжаная, даследаваная і вырашаная ў такой рабоце праблема захавання рэдкіх выданняў. Але паколькі з гэтай справай звязаная не толькі названая дысцыпліна, але і хімія, мікрабіялогія, ясна, што даследаванні мусяць таксама рабіцца і хімікамі, мікрабіёлагамі. Акрамя таго, у сувязі з такім небяспечным паваротам у гісторыі кніжнай справы варта ставіць пытанне і пра патрэбу практыкавання спецыяльных заняткаў або лекцый, семінараў для супрацоўнікаў бібліятэк. З аднаго боку, звычайны бібліятэкар не кампетэнтны ў пытанні вызначэння грыбковага паражэння, з іншага – трэба было б любому работніку кніжніцы разбірацца ў асновах такой праблемы. На жаль, яшчэ шмат хто не ведае або не ўсведамляе гэтай праблематыкі і звязанай з ёй катастрафічнай сітуацыі.

Якія захады павінны рабіць бібліятэкі, выявіўшы такія пашкоджаныя выданні ці нават рукапісы, калі яны ёсць у кніжніцы? Перш за ўсё іх трэба спачатку ізаляваць ад астатняга фонду, каб не даць магчымасці распаўсюджвання заразы на іншыя кніжныя скарбы. Калі ёсць магчымасць, пажадана захоўваць такія асобнікі ў каробках, але з адтулінамі для паступлення ў іх паветра. Трэба памятаць, што адсутнасць паветра стварае найспрыяльнейшыя ўмовы для распаўсюджвання грыбка. Калі выкарыстоўваць, напрыклад, файл для захоўвання кнігі, паветра можа паступаць зверху, але яго будзе недастаткова. Падазроныя на грыбок экзэмпляры мусяць аглядаць спецыялісты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нядаўна, у канцы красавіка – пачатку траўня 2012 г., адбыўся прафесійны візіт беларускіх бібліятэкараў у краіны Заходняй Еўропы, арганізаваны ББА. У праграму ўваходзіла і наведванне бібліятэк. Гэтак у Публічнай гарадской кніжніцы заходненямецкага горада Кобленца мне давялося пабачыць кнігі, нібы абклееныя механічным чынам адмысловай празрыстай мяккай плёнкай, пад якой змяшчаецца бібліятэчны штрых-код. Выданне становіцца нібы заламінаваным. Трэба заўважыць, што калі ставіць пытанне пра засцярогу ад распаўсюду біялагічнай паразы з кнігі на кнігу, дык названая практыка пакрыцця вокладкі плёнкай карысная: грыбок не перадаецца і паветра паступае да кнігі нармальна. Сёння ў большасці нашых бібліятэк, дзе ёсць старадрукі, яшчэ не выкарыстоўваюцца спецыяльныя пальчаткі, прызначаныя для карыстальніка. Ім можа быць як чытач, так і супрацоўнік.

Несумненна, што ў ідэале ў бібліятэцы павінны былі б існаваць рэстаўрацыйныя аддзелы. Але, як зразумела, такое могуць сабе дазволіць галоўныя дзяржаўныя і абласныя кніжніцы. У звычайнай навучальнай установе пашкоджаная, дэфектная кніга не можа ўзнаўляцца. Таму трэба афіцыйна крануць пытанне пра дапамогу такім бібліятэкам з боку дзяржаўных кніжніц нашай краіны.

Напэўна, наконт сказанага тут практычны скептык можа заўважыць: дзе ўзяць грошы на такія дарагія дзеянні, як рэстаўрацыя кніг? Але гаворка ідзе менавіта пра катастрафічную для беларускай культуры сітуацыю. Праблема грыбковага паражэння павінна быць пастаўлена як прынцыповая і найгалоўнейшая ў пытанні захоўвання кніг. Дзеля выратавання кніжных скарбаў быў здзейснены вельмі дарагі праект новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі. Менавіта таму абсурдна сёння спасылацца пры гэтым на эканамічныя цяжкасці. Трэба памятаць, што грыбок можа рапаўсюджвацца з кніг на іншыя дакументы, у тым ліку архіўныя. А гэта ўжо пытанне дзяржаўнага значэння. Акрамя таго, нельга не думаць і пра тое, якую шкоду здароўю людзей робяць кнігі з біялагічным пашкоджаннем.

Такім чынам, праблема захаванасці фонду рэдкіх кніг з кожным годам становіцца ўсё больш вострай, і не вядома, у якім стане можа апынуцца значная частка кніжнага скарбу Беларусі, калі сёння не пачаць яго тэрміновую рэанімацыю. Гісторыя кнігадруку Беларусі мае слаўнае гістарычнае мінулае, нявартыя адносіны да якога былі б непапраўныя для сённяшніх пакаленняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ